Установа “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”

Артыкул

# “Аб сабе хачу пакінуць памяць…”
## да 180-годдзя Францішка Багушэвіча
## і 30-годдзя музея-сядзібы пісьменніка “Кушляны”

(літаратурна-мастацкі часопіс “Маладосць”, сакавік 2020 - №3)

Аўтар:
вядучы метадыст
аддзела навукова-метадычнай і
каардынацыйнай работы
Ушылава Таццяна Вячаславаўна

Мінск 2020

21 сакавіка адзначаецца 180-годдзе з дня нараджэння знакамітага паэта-дэмакрата, публіцыста, грамадскага дзеяча і народнага адваката Францішка Багушэвіча. Сваё 30-годдзе святкуе сёлета і ўнікальны для краіны музей – музей-сядзіба пісьменніка ў Кушлянах.

Літаратурная карта нашай краіны прапануе розныя цікавыя для наведвання кропкі: месцы нараджэння выбітных пісьменнікаў, месцы стварэння знакавых твораў, мясціны, дзе адбываліся падзеі, якія ўвайшлі ў гісторыю беларускай літаратуры ці былі апісаныя ў кнігах. Філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры “Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча “Кушляны” – адзіная сядзіба, дзе жыў і займаўся літаратурнай творчасцю пісьменнік XIX ст., якая захавалася да нашых дзён. Таму рыхтуем паходны заплечнік і накіроўваемся ў шлях да Кушлян.

Сядзіба Францішка Багушэвіча размешчана на паўднёва-заходняй ускраіне вёскі Кушляны Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Гісторыя сядзібы ўзыходзіць да XVIII ст., калі ў 1749 г. за 450 злотых маёнтак набыў Антон Багушэвіч (прапрадзед паэта). Францішак Багушэвіч, як вядома, нарадзіўся 21 сакавіка 1840 г. у фальварку Свіраны недалёка ад Вільні.У перыяд 1841-1846 гг. сям'я перабралася ў спадчынны маёнтак, і свядомыя гады жыцця пісьменніка прайшлі ў Кушлянах. Пасля паўстання 1863-1864 гг. Францішак Багушэвіч, ратуючыся ад рэпрэсій, выехаў з тэрыторыі Беларусі амаль на 20 гадоў. Толькі ў 1884 г. пісьменнік вярнуўся ў Вільню, а ў 1896 г. стаў паўнапраўным гаспадаром сядзібы, пабудаваў новы дом побач са старым бацькоўскім. У маі 1898 г. творца, будучы ўжо цяжка хворым, перабраўся туды на сталае жыццё, дзе ў 1900 г. памёр. Да 1940-х гг. нашчадкі паэта жылі ў спадчынным маёнтку. Пасля Багушэвічаў сядзіба здавалася ў арэнду да 1951 г.

Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча з’яўляецца класічным прыкладам літаратурна-мемарыяльнага музея не толькі таму, што там прайшлі дзяцінства, юнацтва і апошнія гады жыцця пісьменніка. Менавіта там пісаліся творы ўжо для апошніх зборнікаў, лёс якіх і сёння невядомы. Сем’і ўнучак пісьменніка Габрыэлі і Канстанцыі, уцякаючы пасля вайны з Кушлянаў у Польшчу, схавалі толькі лісты Элізы Ажэшкі да іхняга дзеда. Верагодна, значная частка архіва Францішка Багушэвіча згубілася падчас вайны.

У адрозненні ад іншых літаратурна-мемарыяльных музеяў, будынкі музея-сядзібы Ф.Багушэвіча XIX ст. добра захаваліся. Сёння комплекс у Кушлянах уключае сядзібны дом, капліцу, абору і парк. З малых архітэктурных форм засталася драўляная капліца з мясцовай назвай “Народная воля”. Паводле падання, першапачатковая капліца была зроблена рукамі Францішка Багушэвіча і яго блізкіх у памяць ахвяр нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863-1864 гг. Не ацалела драўляная скульптура “Укрыжаванне”, якая да 1939 года знаходзілася ў капліцы.

Добра захавалася гаспадарчая мураваная абора, якая знаходзіцца на паўднёвым захадзе ад сядзібнага дома. Сёння там месціцца выстава прылад працы і прадметаў побыту беларускага сялянства канца XIX ст. – пачатку XX ст.

У Кушлянах можна ўбачыць стары парк на сядзібе з дрэвамі XVIII-XIX ст. Праз алею наведвальнікі могуць трапіць да каменя памяці Францішка Багушэвіча. Калі не стала пісьменніка, блізкія і сябры ініцыявалі выбіццё на валуне надпісу “Pamięci Macieja Buraczka”. Сам творца любіў прыходзіць у гэтае месца, і, па ўспамінах сучаснікаў, пісаць там вершы і хаваць іх у адмысловыя схованкі пад камень. Валун стаў сапраўдным месцам паломніцтва ў Кушлянах. Да знакавых месцаў на тэрыторыі сядзібы можам аднесці і Лысую гару – узвышша, дзе сям’я Багушэвічаў любіла бавіць час.

Сам Францішак з вялікай любоўю ставіўся да родных мясцін і бацькоўскага маёнтку. Гэтае пачуццё перарасло ў значна большае і ў дачыненні да беларускай зямлі:

*...Клікалі ж у госці і клічуць суседзі –*
*Не пайду, не трэба, бо, кажуць, заедзі*
*Ад чужога хлеба губы абсядаюць,*
*Што чужога прагнуць, то сваё кідаюць.*
*Я не кіну хаты, хоць вы мяне рэжце,*
*Не пайду да вас я, хіба ў арэшце.*
*А хоць сілай навет адарвалі б з дому,*
*Калісьці вярнуўся б, як мядзведзь да лому.*
*Заваліцца й хата, зарастуць пакосы,*
*Усё б я вярнуўся, хоць голы ды босы!*

*Урывак з верша “Мая хата”*

Як сядзібны комплекс з такой гісторыяй мог выглядаць яшчэ пры жыцці Францішка Багушэвіча? На жаль, дакладнай дакументацыі, якая б магла тычыцца будаўніцтва новай сядзібы і яе ўладкавання, не засталося. У архіве Уладзіміра Содаля, які захоўваецца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, знаходзім схематычны план сядзібы пісьменніка ў Кушлянах. У 1972 г. Беларусь наведала ўнучка паэта Станіслава Тамашэўская. План быў складзены паводле яе накіду. Верагодна, такі абрыс сядзіба Багушэвічаў мела ў першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

У пасляваенным перыядычным друку можам адсачыць артыкулы, у якіх уздымаецца пытанне пра далейшы лёс сядзібы пісьменніка. З перыядычных выданняў мы даведаліся, што яшчэ ў 1946 г. у доме былі рэчы, якія некалі належалі паэту: мэбля, рэшткі бібліятэкі, рукапісы, партрэты і фатаграфіі сям’і Багушэвіча. У артыкуле Віталя Вольскага для газеты “Літаратура і мастацтва” за 1950 г. таксама ўзгадваецца пра велізарную бібліятэку Багушэвіча, ад якой амаль нічога не засталося. У дапісах адзначаецца неабходнасць захаваць гісторыка-культурную каштоўнасць і стварыць там музей з бібліятэкай.

Добрая захаванасць сядзібна-паркавага комплексу з 1951 г. і да моманту стварэння музея – справа апекуна і вартаўніка сядзібы, прыхільніка творчасці пісьменніка Міхаіла Ляпехі. За гэты час сядзіба перажыла рамонт, які змяніў яе першапачатковы выгляд. У доме быў арганізаваны клуб і Кушлянская сельская бібліятэка імя Францішка Багушэвіча. Паводле слоў Алеся Жамойціна, загадчыка філіяла, намаганнямі Міхаіла Ляпехі ў сядзібу былі вернуты крэслы, фартэпіяна і іншыя рэчы. Сапраўдная атмасфера мемарыяльнасці месца была

створана незвычайным захавальнікам сядзібы, які ведаў шмат вершаў Францішка Багушэвіча, дэкламаваў іх на памяць, калі праводзіў экскурсіі. Дзякуючы такому стаўленню Міхаіла Ляпехі, сядзіба захавалася да нашых дзён нават не маючы статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Наступны віток у гісторыі сядзібы быў звязаны з дзейнасцю Анатоля Янца, які ўзначальваў калгас у Кушлянах з 1980 па 1987 гг.  За гэты час была складзена дакументацыя на рэстаўрацыйныя работы па сядзібе Ф.Багушэвіча, а ўжо ў 1988 годзе  сядзіба была вызначана як помнік гісторыі, пасля чаго пачаліся рэстаўрацыйныя работы па яе аднаўленні. Агульнымі намаганнямі калгаса, улад Смаргонскага раёна і творчай інтэлегенцыі ў Кушлянах у 1983 г. было арганізавана літаратурнае свята. У той год удзячныя кушлянцы пасадзілі каля каменя памяці паэта-земляка 60 саджанцаў дуба (па колькасці пражытых пісьменнікам гадоў). Сіламі мясцовых майстроў на ўзор старой была адбудавана новая капліца на аўтэнтычным падмурку.

У 1990 годзе, да 150-годдзя з дня нараджэння паэта, быў рэалізаваны праект рэстаўрацыі сядзібы. У доме пісьменніка, намаганнямі супрацоўнікаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, створана літаратурна-дакументальная экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці Францішка Багушэвіча. Для наведвальнікаў Музей адкрыўся 2 чэрвеня 1990 г.

У 2005 годзе комплекс “Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча “Кушляны” атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці з прысваеннем III катэгорыі. У мінулым годзе сядзіба, нарэшце, заняла сваё сапраўднае месца ў пераліку скарбаў нашай краіны: яна стала аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны рэспубліканскага значэння (II катэгорыя каштоўнасці). З 1988 г. і па сённяшні дзень загадчыкам філіяла і захавальнікам спадчыны пісьменніка з’яўляецца Алесь Жамойцін.

Літаратурная экспазіцыя заўсёды нараджаецца з чытання. Ажыццяўляючы своеасаблівы “пераклад” з вербальнай мовы на візуальную, яна прадстаўляе свет літаратуры як падзею, творчы працэс, лёс або біяграфію. І праз “музейны твор” наведвальнікі аказваюцца ў свеце пісьменніка. “Словамі” музейнай экспазіцыі з’яўляюцца прадметы, якія належалі пісьменніку і яго часу.

У фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры захоўваюцца асабістыя рэчы сям’і Багушэвічаў. Тыя, што датуюцца к.XIX стагоддзя, верагодна, памятаюць і самога пісьменніка. Вялікае значэнне мае той факт, што яны знаходзяцца менавіта ў сценах дома, які будаваў Францішак Багушэвіч.

Што захавалася да нашага часу? Трэба адзначыць, што сядзіба перажыла шмат гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі цягам XX стагоддзя, што адбілася таксама на колькасці захаваных рэчаў. Сёння ў экспазіцыі Музея-сядзібы прадстаўлены 2 мемарыяльныя пакоі – гасцёўня і кабінет. Літаратурная экспазіцыя месціцца ў трох залах, дзе размешчаны мемарыяльныя рэчы, матэрыялы і дакументы па гісторыі XIX ст., выданні твораў паэта.

Цэнтральнай кампазіцыяй у мастацкім рашэнні сядзібы можна назваць кабінет, які прадстаўляе ўвазе наведвельнікаў своеасаблівую пісьменніцкую “кухню”. Ёсць меркаванне, што да працоўнага месца ў пісьменнікаў ўсяго два

патрабаванні, цяжка дасягальныя ў рэальных бытавых умовах: каб нішто не адцягвала ўвагу, і каб усё неабходнае было пад рукой. Працоўны стол Францішка Багушэвіча да таго ж быў яшчэ і перад вакном, адкуль адкрываліся навакольныя краявіды, якія так любіў пісьменнік.

Кабінетны стол з сукном датуецца канцом XIX стагоддзя, адносіцца да класіцызму з ўплывам эклектыкі і мае аздабленне ў выглядзе вытанчаных форм ножак, разных дэталяў. Можам меркаваць, што менавіта за гэтым працоўным месцам Францішак карпатліва складаў слоўнік беларускай мовы, рыхтаваў зборнік “Беларускія апавяданні Мацея Бурачка” і трэці зборнік вершаў “Скрыпачка беларуская”. Паводле артыкула Антона Луцкевіча з “Запісаў Беларускага Навуковага Таварыства” (Сшытак 1, 1938 г.) у Францішка Багушэвіча былі спецыяльныя скрыначкі, куды ён складаў картачкі з асобнымі словамі, пачутымі ў гутарках. Яшчэ адзін рарытэт знаходзім на стале – драўляная шкатулка з замочкам, якая належала гаспадарам сядзібы. Хто ведае, якія сакрэты яна магла захоўваць у неспакойныя часы?

Адметнасцю экспазіцыі з’яўляецца наяўнасць арыгінальных крэслаў з кабінета пісьменніка. Яны таксама належалі Багушэвічам. Верхняя частка спінак двух крэсел аздоблена разьбой з выявамі птушак і раслін, цэнтральная частка спінкі і сядзенне плеценыя, ножкі фігурныя, разныя. Крэсла з невысокай спінкай атрымала, як шчодры падарунак ад Канстанцыі за добрую службу, Стэфанія Васілеўская – кухарка, якая працавала ў доме пісьменніка яшчэ пры яго жыцці. Дзякуючы таму, што слугі любілі і паважалі Францішка Багушэвіча, гэтыя рэчы захаваліся, і што немалаважна, вярнуліся ў сядзібу праз дзесяцігоддзі. Акрамя мемарыяльных рэчаў у кабінеце знаходзяцца канапа, венскія крэслы, шафа з кнігамі, вазы і столік. Усе гэтыя прадметы запрашаюць нас у вандроўку ў часе.

Гасцёўня – гэта месца для сустрэч са сваякамі, сябрамі, аднадумцамі і нават нечаканымі гасцямі. У гэтым пакоі сядзібы таксама знаходзяцца рэчы сям’і Багушэвічаў. Гэта, напрыклад, фартэпіяна XIX ст. Ёсць і драўляны разны камод са сваёй гісторыяй: калі апошнія Багушэвічы з’язджалі з Кушлян, гэты прадмет мэблі пакінулі ў падарунак Гэлі Каспяровіч (дачцэ Юзафа Каспяровіча, суседа і сябра паэта). Гасцёўня аздоблена прыгожай мэбляй, падсвечнікамі і партрэтамі Францішка і Габрыэлі Багушэвічаў. Красуецца на століку і копія сямейнага альбома Багушэвічаў (арыгінал захоўваецца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, куды трапіў яшчэ ў 1963 г. са школы-інтэрната ў Ашмянах).

Экспазіцыйныя залы музея дэманструюць нямала прадметаў, якія належалі пісьменніку. Ужо падчас рэстаўрацыйных прац 1988-1989 гг., былі знойдзены розныя рэчы: ключ з сядзібы Багушэвічаў, які доўгі час знаходзіўся пад падмуркам ганка, лінейка-закладка, аздобленая разбярнымі накладкамі з раслінным арнаментам і надпісам "ZAKOPANE" і драўляная сальніца з-пад падлогі дома.

Недарэмна рэчы, зробленыя сваімі рукамі, маюць асаблівае значэнне, бо лічыцца, што чалавек укладае ў іх часцінку сваёй душы. Такім важным экспанатам з’яўляецца насценны дыванок, зроблены Канстанцыяй Багушэвіч

яшчэ пры жыцці бацькі. На тканіне чорнага колеру вышыты два буслы ў палёце, а над імі кветкі светла-бежавага колеру з лістамі, унізе і па краях – стылізаваны арнамент. Францішак Багушэвіч вельмі любіў сваю дачушку. Атрымаўшы спадчыну, пісьменнік адразу выправіў Туню вучыцца на спявачку. Паводле артыкула Антона Луцкевіча, вучылася яна за мяжой і павінна была выступіць у знакамітым тэатры “La scala”, але захварэла “на горла” і болей не магла спяваць. Верагодна, Францішак Багушэвіч вельмі балюча перажыў гэтую падзею.

Экспазіцыя музея-сядзібы пісьменніка прадстаўляе і сапраўдныя сямейныя рэліквіі. Фонды Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры захоўваюць копіі спраў аб удзеле ўсёй сям’і Багушэвічаў у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1863-1864 гг. Пацверджанняў удзелу Францішка не было знойдзена, але ён усё роўна вымушаны быў пакінуць Беларусь. А вось адзіная сястра пісьменніка, Ганна Багушэвіч, была арыштавана і заключана ў турму. Па ўспамінах яе сваякоў, дзяўчына ўзяла з сабой рэлікварыі: некалькі шкаплераў, абразоў з машчамі і чахлы да іх. Праз гады рэлікварыі перайшлі па спадчыне ўнуку Ганны, Яну Тарчэўскаму, які з’ехаў пасля Вялікай Айчыннай вайны ў Польшчу. У пачатку 1990-х гг. стрыечны ўнук пісьменніка даслаў сямейныя рэліквіі ў Беларусь, са спадзяваннем убачыць іх у музеі-сядзібе Францішка Багушэвіча. Так і адбылося. У экспазіцыі музея самаробныя рэлікварыі распавядаюць наведвальнікам пра кручастыя лёсы сям’і пісьменніка.

Фонды Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры захоўваюць яшчэ некалькі цікавых прадметаў, звязаных з жыццём Багушэвічаў у Кушлянах. Сярод іх сталовая срэбная лыжка (1874 г.), на якой праглядваюцца рэшткі гравіроўкі і кляймо з выявай вершніка Георгія Перамаганосца, што сведчыць аб месцы стварэння (Масква). У 1993 годзе лыжка была перададзена ў дар музею Францішка Багушэвіча жыхаркай Кушлянаў Марыяй Дудэк. Яе маці, Мальвіна Трусевіч, служыла ў дачкі Багушэвіча: даглядала яе сына Францішка. Унук Багушэвіча быў цяжка хворым, амаль не хадзіў і пасля смерці маці застаўся зусім адзін. Мальвіна Трусевіч і яе дачка Марыя Дудэк даглядалі яго да самай смерці. Набор срэбраных лыжак падараваны Туняй Мальвіне Трусевіч за добрую службу. З іх захавалася толькі адна.

Жыццё Францішка Багушэвіча непарыўна звязана з кушлянскай сядзібай: ад дзяцінства і да апошняга ўздыху. Пісьменніка не стала 28 красавіка 1900 года. Пахаваны ён на Жупранскіх могілках. Па ўспамінах, на пахаванне прыйшло шмат сяброў, прыхільнікаў творчасці, калег і нават дэлегацыя працоўных, арганізаваная Зыгмунтам Нагродскім. Каля вялікага дубовага крыжа былі вянкі са стужкамі з рознымі надпісамі. Ад Нагродскага быў з такімі словамі: “Змоўклі песні тыя, што іграў на дудцы…” (з верша Францішка Багушэвіча). У экспазіцыі музея прадстаўлены стужкі з пахавання пісьменніка, сярод якіх са знакавым надпісам “Мацею Бурачку ад мужыкоў-беларусаў” і іншыя.

*Вецер дзьме і вые,*
*Што аж мыслі рвуцца,*
*Змоўклі песні тые,*

*Што іграў на дудцы.*
*Раз яшчэ зайграю*
*У астатняй хвілі*
*Для тых, што жаль маю,*
*Што мяне забылі…*

Сёння філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры “Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча “Кушляны” – гэта адна з галоўных мемарыяльных літаратурных мясцін нашай краіны і пацвярджэнне таму, што беларусы памятаюць свайго выбітнага пісьменніка. Музей уключаны ў шэраг турыстычных маршрутаў. Наведвальнікі могуць апынуцца ў атмасферы XIX ст., убачыць і адчуць тое, што і некалі сам пісьменнік.

Добрай традыцыяй стала правядзенне “Кушлянскага фэсту” – штогадовага свята, дзе прымаюць удзел народныя майстры, музыкі, этнаграфічныя суполкі, літаратуразнаўцы і прыхільнікі творчасці Францішка Багушэвіча. У гэтым годзе да дня нараджэння пісьменніка Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры падрыхтаваў часовую экспазіцыю, дзе прадстаўлены цікавыя матэрыялы, звязаныя, у тым ліку, і з гісторыяй сядзібы Багушэвічаў. Выстава будзе працаваць да 25 красавіка. Падчас яе працы музей сумесна з Бібліятэкай №14 імя Францішка Багушэвіча праводзіць акцыю “Дудка грае”: кожны, хто бярэ пачытаць творы нашага героя, атрымлівае квіток на бясплатнае наведванне выставы. Запрашаем вандраваць і далучацца да годнага святкавання 180-годдзя абуджальніка беларускага слова і думкі!